Анатоль УСЕНКА:

«ФУТБОЛ, ЯК І ЖЫЦЦЁ, НЕ БЫВАЕ БЕЗ ПАМЫЛАК»

У футболе ёсць трэнеры звычайныя, а ёсць — унікальныя, якіх па ўсім белым свеце адзінкі. Галоўны трэнер беларускай зборнай па міні-футболе сярод інвалідаў па зроку Анатоль Іванавіч Усенка — адзін з такіх спецыялістаў. Ён не ўтойвае, што ўжо даўно мог бы працаваць за мяжой, але, разам з тым, не можа ўявіць, як застанецца без сваіх падапечных — пяціразовых чэмпіёнаў свету і чатырохразовых чэмпіёнаў Еўропы! Сустрэчу з карэспандэнтам «Звязды» Анатоль Іванавіч пачаў з чытання цудоўнага верша, які напісаў нашым тытулаваным футбалістам адзін заўзятар каманды. Верш пра тое, што галоўнае бачыцца сэрцам, а не вачамі…



Фота Надзеі БУЖАН.

Усенка Анатоль Іванавіч — нарадзіўся 14 чэрвеня 1948 года.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры і Вышэйшую школу трэнераў (Масква).

Галоўны трэнер беларускай зборнай па міні-футболе сярод інвалідаў па зроку — пяціразовых чэмпіёнаў свету (1998 г., 2002 г., 2004 г., 2007 г., 2011 г.) і чатырохразовых чэмпіёнаў Еўропы (2001 г., 2007 г., 2009 г., 2012 г.)

Чэмпіён СССР 1982 г., бронзавы прызёр чэмпіянату СССР-1983 у складзе «Дынама» (Мінск).

Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь.

Ганаровы грамадзянін Пухавіцкага раёна.

Узнагароджаны Ордэнам Пашаны, медалём НАКа «За выдатныя заслугі», лаўрэат прэміі «Гордасць нацыі».

ПЕРШЫМ ЧЫНАМ — ДЫСЦЫПЛІНА!

— Напэўна, я так пранікся да сваіх хлопцаў, таму што ў самога было далёка не бясхмарнае дзяцінства. З шасці гадоў выхоўваўся ў Чэрвеньскім дзіцячым доме. Там і пачаў займацца футболам у Леаніда Міхайлавіча Корзуна. Потым пераехаў у Мазыр, наведваў заняткі ў вучылішчы і паралельна гуляў за дзіцяча-спартыўную школу. Калі прыйшоў час выбіраць прафесію, я спыніўся на трэнерскай працы. Хаця тады выпускнікоў дзіцячых дамоў без экзаменаў прымалі ў вышэйшыя ваенныя вучылішчы. Але мне не падабалася ваенная форма *(усміхаецца)*. Вось і вырашыў застацца ў футболе. Тым не менш, калі скончыў універсітэт фізкультуры, як і належыць, адслужыў у арміі. А пасля працягнуў займацца любімай справай: працаваў з маленькімі дзеткамі, трэніраваў футбольную каманду на заводзе. Потым лёс звёў мяне з нашым легендарным трэнерам Эдуардам Васільевічам Малафеевым. Ён прапанаваў мне папрацаваць у футбольным клубе «Дынама» (Мінск). За восем гадоў працы з камандай мы сталі чэмпіёнамі, а потым яшчэ і бронзавымі прызёрамі Савецкага Саюза. Затым я два гады вучыўся ў Вышэйшай школе трэнераў у Маскве, трэніраваў каманду майстроў... Быў у мяне і невялікі перапынак у дзейнасці. І вось у сярэдзіне 1990-х мне прапанавалі патрэніраваць каманду футбалістаў з захворваннямі зроку.

— Памятаеце першыя трэніроўкі?

— Як зараз! Калі хлопцы ў самы першы раз прыйшлі да мяне і я глянуў, як яны гуляюць у футбол, адразу захацеў адмовіцца. Але штосьці мяне спыніла. Уявіце, згадзіцца на прапанову, падарыць людзям надзею, а праз паўтары гадзіны адмовіцца — гэта зусім не па-людску. Вось і пачалі трэніравацца, трэніравацца і трэніравацца... Я сам перавучваўся, бо перайшоў з вялікага футбола ў маленькі (у камандзе па інвафутболе — 5 чалавек, і пляцоўка значна меншая. — **Аўт.**). Перапрацоўваў сістэму трэніровак з улікам цяжкіх захворванняў хлопцаў, карэктаваў нагрузкі. Было цяжка і з педагагічнага пункту гледжання, бо ўсе падапечныя з розных гарадоў. Я мог кантраляваць толькі тых хлопцаў, якія знаходзіліся побач. А іншыя? Скажуць, што ўсё добра, трэнеруюцца, а насамрэч прыйшлі ў залу, паўгадзіны паганялі з мячом... Але ж гэта не трэніроўкі. Так што прыходзілася і з такім змагацца.

— Як праходзіў адбор у каманду?

— Бралі толькі тых, хто быў гатовы шмат трэніравацца і паказваць вынік. Бо сярод кандыдатаў знаходзіліся і звычайныя гультаі, якія хацелі ездзіць на зборы, каб проста пакрасавацца. Зразумела, што ад такіх кадраў мы адмаўляліся. Мая філасофія такая: чалавек павінен ведаць, чаго ён хоча ад жыцця. Цяжка працаваць і займацца футболам — тады толькі працуй, можаш сумяшчаць трэніроўкі і працу — тады сумяшчай. Звычайны натуральны адбор. Затое я шчаслівы за сваіх хлопцаў, якія калісьці пераадолелі гэты адсеў і з якімі мы прайшлі вельмі цяжкі шлях. Сапраўды імі ганаруся, бо ўсе яны атрымалі вышэйшую адукацыю, знайшлі працу, стварылі сем'і, нарадзілі дзяцей.

— Ваш уласны прыклад шмат у чым паўплываў на падапечных?

— Хочацца так думаць. З самага пачатку дамовіліся з хлопцамі, што я — трэнер, а не пастух. Дысцыпліна павінна быць ва ўсім: на футбольным полі і па-за яго межамі, па стаўленні да мяне і да сваёй сям'і.

НЕБЯСПЕЧНЫ ЗАНЯТАК

— Чаму футбол сярод людзей з хваробамі зроку не ўваходзіць у паралімпійскую праграму?

— Так склалася, што наш від спорту з самага пачатку не з'яўляўся паралімпійскім. Планавалася, што да Алімпіяды ў Лондане сітуацыя зменіцца. Але не спрацаваў алімпійскі прынцып: на некаторых кантынентах дагэтуль няма падобных футбольных каманд — у Афрыцы, напрыклад. Зараз у паралімпійскую праграму ўваходзіць толькі футбол сярод татальна сляпых. Але ў Беларусі гэты від не вельмі развіты. Каб прабіцца на Паралімпіяду, зборная павінна добра выступаць на кантынентальных і сусветных першынствах. А беларуская каманда сярод татальна сляпых, на маёй памяці, толькі раз удзельнічала ў чэмпіянаце Еўропы. І больш я пра гэтых хлопцаў нічога не чуў. Адкуль? У нас жа не праводзіцца чэмпіянат краіны па футболе сярод татальна сляпых.

— А што датычыцца чэмпіянату Беларусі па футболе сярод людзей з асаблівасцямі зроку?

— Наш чэмпіянат слабее. Раней у ім выступала 12 каманд, а зараз ледзь набіраем пяць. Справа ў тым, што закрываецца шмат прадпрыемстваў, дзе працуюць інваліды, а дзіцяча-спартыўных школ, у якіх займаюцца дзеці з асаблівасцямі зроку, увогуле няма. Ёсць школы-інтэрнаты. Але бацькі іх навучэнцаў забараняюць сваім сынам на прафесійным узроўні займацца футболам. Гэта, безумоўна, можна зразумець. У гэтых хлопчыкаў вельмі сур'ёзныя захворванні, яны ў любы момант могуць стаць цалкам сляпымі.

— Што можа змяніць стаўленне бацькоў такіх дзяцей да інваспорту?

— Важна зразумець, што праз спорт (напрыклад, футбол, валейбол ці баскетбол) такія дзеці праходзяць рэабілітацыю — як сацыяльную, так і фізічную. Нездарма кажуць, што рух — гэта і ёсць жыццё. Але мала хто думае гэтак жа. Часам даводзіцца чуць, у тым ліку і ад чыноўнікаў, што інвалід павінен ляжаць у ложку і нічога не рабіць. Мне, як галоўнаму трэнеру, які па макулінках збіраў сваю каманду, крыўдна чуць падобныя словы.

У АДНЫМ ФЛАКОНЕ

— Раскажыце, як праходзіць ваш трэніровачны дзень?

— Трэба зразумець, што мы трэніруемся тады, калі нам выдзяляюць залу. Часцей за ўсё гэта ў восем гадзін раніцы ці ў дзесяць вечара. Уявіце, футбаліст прачынаецца, ідзе на працу, вяртаецца дадому, вячэрае — і адпраўляецца на трэніроўку. У выніку дадому галава сямейства вяртаецца апоўначы. Жонка не бачыць мужа, дзеці — бацьку. У гэтым плане я яшчэ выконваю функцыі сямейнага псіхолага. Нярэдка даводзіцца ўгаворваць жонак маіх футбалістаў дазволіць ім працягваць займацца спортам. А была б нейкая трэніровачная база — не існавала б такіх праблем. Я ўжо не кажу пра тое, што ў нас няма ўрачоў. Хлопцы гуляюць у футбол з такімі цяжкімі захворваннямі, рызыкуюць стратай зроку, а на пляцоўцы няма медперсаналу! Так і атрымліваецца, што я і трэнер, і менеджар, і ўрач, і псіхолог — усё ў адным флаконе.

— Вы пабывалі не на адным чэмпіянаце свету і Еўропы, бачылі каманды з іншых краін. Стаўленне да вашага віду спорту ў Беларусі і за мяжой значна адрозніваецца?

gs.by

— Безумоўна. Не скажу, што замежныя каманды маюць больш сур'ёзную падтрымку ад дзяржавы. Мабыць, яна таксама невялікая, але... проста іншая. Там дапамагаюць інваспартсменам не дзеля адмашкі, а дзеля таго, каб яны адчувалі сябе роўнымі сярод роўных. У нас жа, пакуль не абаб'еш усе парогі, падтрымкі не пабачыш. А часам і забегі па кабінетах не дапамагаюць. Напрыклад, сёлета не знайшлося сродкаў, каб адправіць каманду на планетарнае першынство. А мы ж рыхтаваліся, трэніраваліся, праводзілі рэабілітацыю за ўласныя грошы! Гэта ўсё адно, што паабяцаць сыну ці дачцэ паездку на мора, а потым сказаць: «Ты нікуды не паедзеш». Слёзы, крыўда, неразуменне. Але больш за ўсё я не разумею, чаму пяціразовым чэмпіёнам свету дагэтуль не прысвоілі звання заслужаных спартсменаў краіны. Па законе належыць! Між тым дакументы на прысваенне гэтых званняў ужо два гады ляжаць у Міністэрстве спорту. Не ведаю, якімі словамі тлумачыць хлопцам, чаму так адбываецца.

— Таксама вы трэніруеце футбалістаў з праблемамі па слыху...

— Так. Зараз у мяне такіх 40 чалавек. Ведаеце, першыя пяць месяцаў трэніровак думаў, што з глузду з'еду. Калі мае хлопцы дрэнна бачаць, але чуюць без праблем, то гэтыя футбалісты амаль нічога не чуюць і, адпаведна, мала што разумеюць. Спачатку даводзілася літаральна вадзіць іх за ручку і на пальцах тлумачыць, як гуляць у нападзенні, як дзейнічаць у абароне. Я заўсёды кажу: не бывае футбола без памылак, як не бывае і жыцця без памылак. Зараз мае новыя байцы нарэшце пачалі перамагаць. Дык у мяне душа спявае!

КАМАНДА БЕЗ БУДУЧЫНІ?

— Адной з праблем інвафутбола вы называлі адсутнасць новага пакалення спартсменаў. Атрымліваецца, што ў каманды няма будучыні?

— Баюся, што так і ёсць. Многім маім хлопцам ужо за трыццаць гадоў. Колькі яны яшчэ змогуць займацца футболам на высокім узроўні? Год, два, тры... А што потым? Пераемнікаў няма. Я ўжо казаў, што бацькі неахвотна адпускаюць сваіх дзяцей у прафесійны спорт. Але тут справа яшчэ і ў тым, што ў сучасных дзяцей — іншыя інтарэсы: камп'ютары, мабільныя тэлефоны, планшэты. Фізічная культура ўжо не тое што на другім плане... добра, калі не на дзясятым! І гэта датычыцца як здаровых дзяцей, так і тых, хто мае некаторыя абмежаванні.

— Раскажыце, калі ласка, ці атрымлівае ваша каманда спонсарскую дапамогу?

— Так. Свет усё ж такі не без добрых людзей. Але хачу сказаць, што нас падтрымліваюць не толькі буйныя прадпрыемствы. У апошні час камандзе шмат дапамагала Беларуская федэрацыя футбола, за што асобна «вялікі дзякуй» былому прэзідэнту федэрацыі Генадзю Мікалаевічу Нявыгласу. Нам аплачвалі пераезды-пералёты на спаборніцтвы, давалі сутачныя, налічалі прэміі. Што датычыцца спонсарскай падтрымкі, то яна ёсць. Хтосьці купіць некалькі мячоў, хтосьці — камплект формы. З экіпіроўкай нам вельмі дапамагае кампанія «Umbro». Атрымлівалі садзейнічанне ад «Макдональдса». Яны выдавалі талоны на харчаванне, і хлопцы маглі там без праблем абедаць. Але, безумоўна, падтрымка магла б быць больш адчувальнай. Ведаеце, у мяне шмат праектаў і задумак, былі б толькі магчымасці для іх рэалізацыі. Напрыклад, я шмат езджу па Мінскай вобласці, праводжу майстар-класы і таварыскія матчы для дзяцей-сірот, навучэнцаў інтэрнатаў для інвалідаў. Зразумела, што ўсё гэта за ўласны кошт. Зараз я мару аб тым, каб знайсці неабыякавага чалавека, які б мог, напрыклад, аплаціць транспарт, каб навучэнцы мінскай школы інвалідаў па зроку ці па слыху маглі б з'ездзіць у Гродна і сыграць таварыскі матч з мясцовымі хлопцамі. Гэта ж папулярызацыя футбола!

«РАБЛЮ ЛЮДЗЕЙ ШЧАСЛІВЫМІ!»

— Напэўна, не памылюся, калі скажу, што ў вашай каманды, вопытнай і тытулаванай, ёсць свае заўзятары?..

— Безумоўна, ёсць. Па-першае ўсё дзякуючы таму, што мы ўжо на працягу шасці гадоў прымаем удзел у чэмпіянаце горада сярод здаровых людзей. І каманда там не на апошніх ролях. Калі ў першынстве ўдзельнічаюць 33 дружыны, то мае хлопцы займаюць трынаццатае месца. Па-другое, за сямнаццаць гадоў існавання ў каманды, вядома, з'явіліся сябры. Калі мы прыязджаем на спаборніцтвы, нас пазнаюць, некаторыя нават па-добраму зайздросцяць, што каманда без нейкіх фантастычных умоў дабіваецца такіх поспехаў.

— Атрымліваеце задавальненне ад таго, чым займаецеся?

— Яшчэ як! Ведаеце, нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, я шчаслівы трэнер. Бо за гэтыя гады было шмат момантаў, калі прыходзіла разуменне, што ўсё нездарма. Напрыклад, калі заканчваецца матч і мы становімся чэмпіёнамі свету ці Еўропы. У гэтыя хвіліны я гляджу кожнаму ў вочы. Вы б бачылі, як яны блішчаць! Няма ніякіх праблем, хвароб, толькі вялікая радасць і асэнсаванне таго, што ты НАЙЛЕПШЫ.

— Тым не менш прыходзіцца спускацца з нябёсаў на зямлю — да цяжкасцяў, перашкод і непаразумення. Адкуль бяруцца сілы і жаданне працягваць займацца гэтай нялёгкай справай?

— Я не ведаю. Вось такі я. Прачынаюся раніцай і адразу пачынаю думаць, дзе знайсці лячэнне для хлопцаў, як здабыць пляцоўку для трэніровак... Але я працую не проста так. Працую, каб рабіць людзей шчаслівымі. І сапраўды не разумею, чаму людзі развучыліся рабіць адно аднаму дабро.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Вярціна. Гвоздзік. Кана. Бабка. Арк. Ялак. Кіо. Загла. Кубо. Сун. Кра. Біктара. Пан. Лі'а. Уор. Кантан. Гітара. Сігабрт. Тар. Турнір. Ко-ка. Нін. Гонар. Стан. Кон. Сіна. Сад. Ліп. Ібіс. Лусака. Кардыз. Ром. Готыка. Цынін. Бар. Танкетка.

Па вертыкалі: Сандзіба. Скіт. Фонск. Атам. Пара. Сар-фір. Ружа. Смуга. Тата. Ярка. Панна. Крама. Абак. Нор-ма. Мара. Самян. Каса. Ананас. Міна. Удар. Дзевяка. Карэіз. Ром. Готыка. Цынін. Бар. Танкетка.

■ У рэгіёне

«ЗАЛЮСТЭР'Е-2013».

У Докшыцкім раёне прайшоў абласны фестываль тэатральнага мастацтва для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця «Залюстэр'е».

Ганаровым госцем свята стала сям'я Карлэцці з Італіі, якая ўжо даўно сябруе з інтэрнатам, дапамагае выхаванцам у якасці мецэнатаў. Напрыклад, яны сталі спонсарамі гэтага тэатральнага конкурсу. Цікава, што ў сябе на радзіме Джавані і Гая Карлэцці таксама маюць стасункі з «незвычайнымі» дзецьмі — працуюць у фірме, якая займаецца аказаннем сацыяльных паслуг. Разам з італьянскімі дзецьмі ставяць спектаклі, робяць кінафільмы... Дарэчы, падчас «Залюстэр'я» яны прэзентавалі свой фільм, які быў зроблены на лонданскай Алімпіядзе.

Цікава, што на фэсце выступілі і былыя выхаванцы школы-інтэрната, а таксама педагогі. А ўладальнікамі І-й прэміі сярод канкурсантаў сталі маленькія акцёры з Багушэўска.

«НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ»

У Расонскім раёне рыхтуюцца да правядзення фестывалю сельскага турызму «Заборскі фэст». Штогод гэты фестываль збірае дзясяткі ўдзельнікаў і гасцей не толькі з Беларусі, але і з краін далёкага замежжа. «Заборскі фэст» стаў своеасаблівым брэндам Беларусі. Пра яго ведаюць нават за акіянам.

— Сёлета фэст адбудзецца 29 чэрвеня. У яго рамках будзе праведзены кірмаш рамёстваў, на якім уладары сядзіб, а таксама прадстаўнікі дамоў рамёстваў, народныя майстры змогуць рэалізаваць тавары і прадукты ўласнай вытворчасці, — паведаміў **Віктар ЯРШОЎ, старшыня грамадскага савета па развіцці аграэкатурызму Віцебскай вобласці.** — Для гасцей і ўдзельнікаў фестывалю будзе арганізавана тэатралізаванае прадстаўленне «На вайне як на вайне» — у музеі партызанскага побыту.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Организация
КУПИТ, СНИМЕТ В АРЕНДУ
СКЛАДСКИЕ И ПРОИЗВОДСТВЕННЫЕ ПОМЕЩЕНИЯ ПОД ОРГАНИЗАЦИЮ ПИЩЕВОГО ПРОИЗВОДСТВА
Площадь от 700-1500 кв.м. в г.Бресте, г.Могилеве, г.Гродно, г.Гомеле, г.Витебске, г.Минске (Минский р-н).
Желательно наличие всех коммуникаций.
Тел.: 8 (044) 7888 503
ООО "Европорт" УНП 101168731

СЁННЯ

Месяц

Поўня 23 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 4.38	21.46	17.08
Віцебск	— 4.20	21.44	17.24
Магілёў	— 4.28	21.36	17.08
Гомель	— 4.35	21.23	16.48
Гродна	— 4.55	21.59	17.04
Брэст	— 5.06	21.50	16.44

Імяніны

Пр. Ганны, Аўксенція, Андрэя, Ануфрыя, Арсенія, Івана, Пятра, Сцяпана, Феафіла.
К. Дароты, Люцыі, Элеаноры, Вільгельма, Вітольда, Максіма.



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Чатыры дні прасядзела на дыеце. Ноччу захацелася піць. Падышла да халадзільніка. Далей усё як у тумане... Ачомалася, калі запівала шакаладку баршчом.

— Хто сказаў, што крыкам ад людзей нічога не дамагчыся?! Вы не знаёмыя з маёй гадавалай дачкой...

Хачу на мора гэтым летам. У мяне традыцыя такая — кожнае лета хацець на мора...

Аэрапорт. Пасля сутак чакання далі «зялёнае святло», нарэшце запрацавала мытня. Мытнік весела пытаецца злога пасажыра:
— Зброю, наркотыкі маеце?
— Калі б меў, даўно б выкарыстаў...

Жонка сказала: «Давай спынімся каля крамы, хлеба купіць». Карацей кажучы, ледзь багажнік зачыніў...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 24.012. Індэкс 63850. Зак. № 2738.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 чэрвеня 2013 года.